*Тв.*: Пути оптимизации сельскохозяйственных комплексов. Мн., 1981; Особенности технологической и архитектурно-планировочной организации сельскохозяйственных комплексов. Мн., 1984.

**МАЛО́Е БА́ХАВА**, вёска ў Дубровенскім р-не Віцебскай вобл. Цэнтр сельсавета. За 7 км на Пд ад г. Дуброўна, 99 км ад Віцебска, 16 км ад чыг. ст. Асінаўка. 18 ж., 12 двароў (1999). Клуб, б-ка, аддз. сувязі.

**МАЛО́Е БЕ́ЛАЕ ВО́ЗЕРА**. У Полацкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Свіна (выцякае з возера), за 52 км на ПнУ ад Полацка. Пл. 0,9 км$^2$, даўж. каля 2,1 км, найб. шыр. 870 м, найб. глыб. 11 м, даўж. берагавой лініі каля 6,4 км. Пл. вадазбору 1 км$^2$. Схілы катлавіны выш. 11—12 м (на У да 20 м), пясчаныя, пад лесам. Берагі пясчаныя, на ПдУ тарфяністыя. На Пд да возера прымыкае масіў вярховага балота. Мелкаводдзе вузкае, дно да глыб. 2,5—4 м пясчанае, ніжэй сапрапелістае. Вада вызначаецца нізкай мінералізацыяй (60—80 мг/л), чысцінёй і высокай празрыстасцю. У возеры расце палушнік азёрны, занесены ў Чырв. кнігу Беларусі.

**МАЛО́Е ВО́ЗЕРА**. У Смалявіцкім р-не Мінскай вобл., у бас. р. Гайна, за 13 км на Пн ад г. Смалявічы. Пл. 0,4 км$^2$, даўж. 1 км, найб. шыр. 550 м, даўж. берагавой лініі каля 2,5 км. Пл. вадазбору 6,8 км$^2$. Схілы катлавіны выш. да 2 м. Берагі забалочаныя. Пойма шыр. 100 — 200 м, забалочаная, пад лесам. Злучана канавай з р. Усяжа.

**МАЛО́Е МАЖЭЙКАВА**, вёска ў Гасцілаўскім с/с Лідскага р-на Гродзенскай вобл., на правым беразе р. Лебяда. Цэнтр аграфірмы «Мажэйкава». За 28 км на ПдЗ ад Ліды, 85 км ад Гродна, 4 км ад чыг. ст. Скрыбаўцы. 794 ж., 301 двор (1999).

Упершыню згадваецца ў 1511 як маёнтак у Жалудоцкай вол. Трокскага ваяв., падараваны вял. кн. ВКЛ Жыгімонтам І Старым віленскаму падканюшаму Шымку Мацкавічу. Належаў Палубенскім, Нарушэвічам-Брахоцкім і інш. З 1795 у Рас. імперыі, у 2-й пал. 19 ст. сяло Лідскага пав. Віленскай губ. У 1897 нар. вучылішча, царква, капліца. З 1921 у складзе Польшчы, у Лідскім пав. Навагрудскага ваяв. З 1939 у БССР, з 1940 цэнтр Мажэйкаўскага с/с *Жалудоцкага раёна*, з 1954 вёска ў Гасцілаўскім с/с. З 1962 у Лідскім р-не, з 1987 цэнтр Гасцілаўскага с/с. У 1972—502 ж., 161 двор.

Спіртзавод, лікёра-гарэлачны цэх, сярэдняя школа, Дом культуры, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Помнік архітэктуры — сядзіба (19 ст.). *Г.І.Дулеба.*

**МАЛО́Е ПРАДПРЫЕ́МСТВА**, самастойны суб'ект гаспадарання з правамі юрыд. асобы. Формы ўласнасці — любыя. Адметныя адзнакі М.п. — крайне невял. доля ў агульным па краіне аб'ёме дзейнасці, якая з'яўляецца профільнай для прадпрыемства, і абмежаванні колькасці працуючых (адрозніваюцца ў розных сферах эканомікі). Да М.п. адносяцца вытв. і кансалтынгавыя фірмы (гл. *Кансалтынг*), многія прадпрыемствы рознічнага гандлю і сферы абслугоўвання. М.п. ўзмацняе дзелавую актыўнасць грамадзян і пашырае спектр іх магчымасцей, садзейнічае структурнай перабудове эканомікі, дэманапалізацыі вытв-сці і развіццю канкурэнцыі, вырашэнню праблемы занятасці насельніцтва, аператыўнаму рэагаванню вытв-сці канкрэтных тавараў і паслуг на змены спажывецкага попыту і інш.

**МАЛО́Е СВІНО́**, возера ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Свіна, за 37 км на ПнЗ ад г. Гарадок. Пл. 1,06 км$^2$, даўж. каля 2,9 км, найб. шыр. 900 м, найб. глыб. 6,7 м, даўж. берагавой лініі каля 7,3 км. Пл. вадазбору 12,9 км$^2$. Схілы катлавіны выш. да 20 м (на Пд да 10 м), пясчаныя, параслі лесам. Берагі зліваюцца са схіламі, на ПдУ і З нізкія, пясчаныя. Дно да глыб. 2,5—4 м пясчанае, ніжэй ілістае і сапрапелістае. Злучана пратокай з воз. *Вялікае Свіно.*

**МАЛО́Е СІ́ТНА**, вёска ў Полацкім р-не Віцебскай вобл., на р. Палата, каля воз. Ізмак. Цэнтр сельсавета. За 50 км на ПнУ ад г. Полацк, 95 км ад Віцебска, 6 км ад чыг. ст. Алешча. 387 ж., 176 двароў (1999). Лесаўчастак, сярэдняя школа, клуб, б-ка, камбінат быт. абслугоўвання, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан. Каля вёскі земляное ўзвышша ад *Сітнаўскага замка.*

**МАЛО́Е ЧАРНО́ВА**, возера ў Гарадоцкім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Чарнаўка, за 16 км на ПнЗ ад г. Гарадок. Пл. 0,25 км$^2$, даўж. каля 1,2 км, найб. шыр. 350 м, даўж. берагавой лініі каля 2,9 км. Пл. вадазбору 18,1 км$^2$. Схілы катлавіны выш. да 10 м, пераважна пад хмызняком, на Пд і ПнЗ разараныя. Праз возера цячэ р. *Чарнаўка.*

**МАЛО́Е Я́ЗНА**, возера ў Міёрскім р-не Віцебскай вобл., у бас. р. Авута, за 40 км на ПдУ ад г. Міёры. Пл. 0,2 км$^2$, даўж. 820 м, найб. шыр. 320 м, даўж. берагавой лініі 2 км. Пл. вадазбору 14,2 км$^2$. Злучана пратокай з воз. *Вялікае Язна.*

**МАЛО́Й МЕХАНІЗА́ЦЫІ СРО́ДКІ**, ручныя машыны, абсталяванне і прыстасаванні, якія разам з асн. тэхнал. абсталяваннем забяспечваюць комплексную механізацыю вытв. працэсаў. Выкарыстоўваюцца ў буд-ве, машынабудаванні, лясной, дрэваапрацоўчай і інш. галінах прам-сці, а таксама ў сферы быту і абслугоўвання насельніцтва.

Да М.м.с. адносяць транспартныя і грузападымальныя сродкі (*пад'ёмныя краны, пад'ёмнікі*, цялежкі, самаходныя шасі і інш.), *грузазахопныя прыстасаванні*, сродкі кантэйнерызацыі і пакетавання (*кантэйнеры*, паддоны, касеты, падхопы і інш.), захоўвання і падачы матэрыялаў (*бункеры*, бочкі, скрыні і да т.п.), арг-цыі рабочых месцаў (рыштаванні, памосты, люлькі, драбіны і інш.), спец. сродкі для мантажных, апалубачных, буд. работ і інш. Да М.м.с. адносяць таксама ручныя машыны і ручны інструмент.

*Літ.*: Сухачев В.П., Каграманов Р.А. Средства малой механизации и вспомогательное оборудование для производства строительно-монтажных работ. М., 1981. *І.І.Леановіч.*

**МАЛО́НАВАЯ КІСЛАТА́**, $CH_2(COOH)_2$, двухасноўная кіслата насычанага раду. У свабодным выглядзе прысутнічае ў раслінах: лісці бабовых, зялёных ч. злакаў і парасонавых, пладах лімону. Удзельнічае ў абмене рэчываў у раслін і жывёл у форме соляў — маланатаў, у біясінтэзе тлустых кіслот. М.к. можа дэкарбаксіліравацца з утварэннем ацэтылкаферменту А, які ўдзельнічае ў цыкле трыкарбонавых к-т. Солі М.к. — інгібітары клетачнага дыхання.

**МАЛО́ТКАВІЧЫ**, вёска ў Пінскім р-не Брэсцкай вобл.; чыг. станцыя на лініі Пінск — Брэст. Цэнтр сельсавета і калгаса. За 12 км на З ад г. Пінск, 163 км ад Брэста. 2419 ж., 698 двароў (1999). Лясніцтва, зверагаспадарка, сярэдняя і муз. школы, школа-інтэрнат, Дом культуры, 2 б-кі, бальніца, амбулаторыя, аптэка, аддз. сувязі. Брацкая магіла сав. воінаў і партызан.

**МАЛО́ТНЕВА**, другая назва *Малочнага возера.*

**МАЛО́Х** (грэч. Moloch ад фінікійскага уладар), у рэлігіі стараж. фінікіян і карфагенян бог сонца, якому штогод прыносілі чалавечыя ахвяры — забівалі ці спальвалі дзяцей знатных грамадзян, часам ваеннапалонных. У перан. сэнсе — страшная ненажэрная сіла, якая патрабуе чалавечых ахвяр.

**МАЛО́ЧНАЕ ВО́ЗЕРА**, Малотнева, возера ў Гродзенскім р-не, у бас. р. *Пыранка* (выцякае з возера), за 30 км на ПнУ ад г. Гродна. Пл. 0,78 км$^2$, даўж. каля 2,4 км, найб. шыр. 450 м, даўж. берагавой лініі каля 5,2 км. Схілы катлавіны выш. 4—5 м, пад лесам, участкамі на ПнЗ і ПдЗ разараныя. Берагі высокія, на З і У абразійныя. Дно сапрапелістае.

**МАЛОЧНАКІ́СЛЫЯ БАКТЭ́РЫІ**, узбуджальнікі малочнакіслага браджэння. Развіваюцца на складаным пажыўным асяроддзі. Трапляюцца ў малацэ і малочных прадуктах, на раслінах і раслінных рэштках, у кішэчніку чалавека і жывёл.

Бяссporавыя грамстаноўчыя палачкі і кокі. Факультатыўныя анаэробы. Гомаферментатыўныя М.б. расшчапляюць цукры пераважна да малочнай к-ты і выкарыстоўваюцца ў вытв-сці кісламалочных прадуктаў, *малочнай кіслаты*, гетэраферментатыўныя ўтвараюць таксама воцатную к-ту, спірты, эфіры, удзельнічаюць у працэсах сіласавання кармоў, квашанні капусты, выкарыстоўваюцца ў вытв-сці дэкстранаў (для заменнікаў плазмы крыві). Гл. таксама *Лактабацылы.*

**МАЛО́ЧНАЯ КІСЛАТА́**, α-оксіпрапіёнавая кіслата, $CH_3CH(OH)COOH$, монакарбонавая оксікіслата. Пашырана ў прыродзе, утвараецца з цукрыстых рэчываў пры малочнакіслым браджэнні. У значнай колькасці назапашваецца ў квашанай капусце, саленнях, кіслым малацэ, выспяваючых сырах. Бясколерныя крышталі, добрарастваральныя ў вадзе. Солі М.к. (лактаты) — канчатко-